# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### Кватэра

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

,,,  ТЭ  ,

*2. Прачытайце словы, якія «схаваліся» ў слоўнікавым слове. Выкарыстоўвайце белыя клеткі-падказкі. Запішыце словы.*

| к | в | а | т | э | р | а |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |

______________

______________

______________

______________

______________

***Ват*** *— адзінка вымярэння магутнасці электрычнага току.*

***Эра*** *— буйны гістарычны перыяд, эпоха.*

*3. Прачытайце загадку. Дапоўніце яе слоўнікавым словам.*

Белы дамок у _________ы стаіць,
У ім круглы год
Дзед мароз
То буркоча, то спіць.

*(Міхась Пазнякоў* [1, с. 93]*)*

*Запішыце адгадку.*

*4. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

Раўчук прачнуўся, выбег жвава,
Вачам сваім не верыць —
Зіма павесіла аб'яву:
«Здаю вясне _____________».

*(Мікола Чарняўскі* [2, с. 23]*)*

***Жва́ва*** *— хутка.*

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.*

*5. Прачытайце загадку. Дапішыце прапушчаныя літары ў слоўнікавыя словы.*

Для ўсіх паверхаў — т
Адна ква___ра. і
На ўсе паверхі ф
Выходзяць ___веры. л

*(Анатоль Клышка* [3, с. 40]*)*

*Злучыце «рассыпаныя» літары, каб атрымалася адгадка.*

### Відэлец

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

я = і  ,, , а = э 

*2. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

е і я

в..дэл..ц

*3. Разгледзьце малюнкі. Што на іх намалявана? Як можна назваць усе гэтыя рэчы?*

*Назавіце сталовы прыбор, які кладуць злева ад талеркі. Запішыце яго назву, падзяліўшы для пераносу.*



*4. Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку.*

Чатырма ён зубамі бярэ
пакрысе́.
Хоць не есць,
міма рота, аднак, не нясе.

*(Анатоль Клышка* [3, с. 69]*)*

***Пакрысе́*** *— патроху, невялікімі часткамі.*

*5. Падпішыце малюнкі.*



*Пастаўце націск у словах.*

*6. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

**Перасцярога**

Запомніце, дзеці:
Запа́лкі-сярні́чкі,
Нажы і _____________,
Іголкі, нажнічкі —
Усё гэта рэчы,

---

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

З якімі малечы
Няможна бяспечна,
Бы ў цацкі, гуляць,
Бо страшная можа
Бяда напаткаць.
*(Ніл Гілевіч* [4, с. 15]*)*

***Запа́лкі*, *сярні́чкі*** — *рус. спички.*
***Мале́чы*** — *маленькія дзеці.*
*У слоўнікавым слове падкрэсліце літару, якая ў рускай мове пішацца па-іншаму.*

### Калідор

*1. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

р  л

ка..ідор

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*2. З «рассыпаных» літар складзіце як мага больш слоў. Падкрэсліце сярод іх слоўнікавае слова.*
р, л, і, д, а, к, о

*3. Дапоўніце сказы патрэбнымі словам.*
Праход, які злучае асобныя часткі кватэры, — гэта ____________.
Невялікі калідор — гэта _____________.
Работнік гасцініцы, які абслугоўвае нумары, — гэта _______________.
***Словы для даведкі:*** калідорны, калідор, калідорчык.

*4. Дапішыце ў словы патрэбныя літары, каб атрымаліся назвы школьных памяшканняў. Зафарбуйце слоўнікавае слова.*

| | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | а | б | і | н | е | т | | |
| спартыўная | | | | | | з | | л | а | | | | | | |
| | | | | | | к | | а | с | | | | | | |
| | | | | | | б | | б | л | і | я | т | э | к | а |
| | | | | г | а | р | | э | р | о | б | | | | |
| | | | с | т | а | л | | в | а | я | | | | | |
| | м | а | й | с | т | э | | н | я | | | | | | |

*5. Запішыце сказ пад дыктоўку.*
У час перапынку вучні выйшлі на калідор.
*Падзяліце слоўнікавае слова на склады вертыкальнымі лініямі.*

### Лесвіца

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

  ,,, ца

*2. Закрэсліце літару, якая паўтараецца. Запішыце слова, якое атрымалася.*
ЛТЕТСТВТІТЦТА
*Пастаўце націск у слоўнікавым слове, лініямі (|) падзяліце яго на склады.*

*3. Якая літары «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

н  в

лес..іца

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*4. Знайдзіце слова, якое схавалася ў слоўнікавым слове, і запішыце яго.*
лесвіца ___________

*5. Дапішыце на месцы пропускаў патрэбныя літары. Злучыце кожнае слова з яго значэннем.*

| | |
|---|---|
| ле__ічка | збудаванне ў выглядзе раду ступенек для пад'ёму і спуску |
| ле__ічны | маленькая ле__іца |
| ле__іца | які мае адносіны да ле__іцы |

*Дапоўніце спалучэнні слоў патрэбнымі словамі.*
каменная ____________
_____________*ая пляцоўка*
лёгкая __________
___________*ыя* ступенькі

*6. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

Хто там грукае ў акно?
Гэта вы, сінічкі?
Я прачнулася даўно,
Запляла касічкі.

Вось надзену кажушок,
Выбегу на ганак,
З ____________ змяту сняжок,
Вынесу сняданак.
*(Васіль Вітка* [5, с. 94]*)*

*Паразважайце, што магла падрыхтаваць дзяўчынка на сняданак сінічкам.*

*7. Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку.*

Вось і праява — ну і ну!
Кульгавая дарога
Палезла на сцяну!
*(Анатоль Клышка* [3, с. 39 ]*)*

***Кульга́вая*** — *рус. хромая.*
*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
2. *Чарняўскі, М. М.* Ці растуць грыбы ў Грыбна : вершы, прымаўлянкі-забаўлянкі, загадкі, шарады, казкі : для мал. і сярэд. шк. узросту / М. М. Чарняўскі. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 62 с.
3. *Клышка, А. К.* Тысяча арэшкаў : загадкі для дзяцей і дарослых / А. К. Клышка. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 127 с.
4. Вясёлка. — 2009. — № 12. — С. 15.
5. *Вітка, В.* Урокі роднага слова : вершы, казкі, апавяданні : для мал. шк. узросту / В. Вітка ; склад. Т. С. Тарасава ; маст. М. Р. Казлоў. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 264 с.


**Крыніцы ілюстрацый:** http://detskiychas.ru/wp-content/uploads/2014/06/skazka_pro_morkov.jpg; https://www.images.lesyadraw.ru/2013/05/kak_naricovat_raka_karandashom.jpg; http://zabavnik.club/wp-content/uploads/2018/07/KARTINKA_DLYa_DETEY_VEDRO_4_16011528.jpg; https://media.istockphoto.com/vectors/sketch-drawing-hand-with-index-finger-vector-id496920445; https://ja-rastu.ru/uploads/posts/2013-11/thumbs/1384770070_2.jpg; http://pngimg.com/uploads/fork/fork_PNG3067.png; https://st03.kakprosto.ru/tumb/680/images/article/2011/11/22/1_525506a45bf16525506a45bf56.jpg; http://idrawing.ru/images/articles/114-cherry/cherry10.jpg.


***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*



## Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» прапануе!

**В. І. Свірыдзенка, Н. М. Антановіч**

## Метадычныя рэкамендацыі па засваенні правапісу слоўнікавых слоў на ўроках беларускай мовы




У асобных дапаможніках для II, III і IV класаў прапануюцца метадычныя рэкамендацыі па засваенні правапісу слоўнікавых слоў, каляровыя зрокавыя апоры, рукапісны варыянт слоўнікавых слоў, практыкаванні са слоўнікавымі словамі.

**Зрокавыя апоры** можна выкарыстоўваць для франтальнай работы ў класе. З апорай на малюнак арганізуецца знаёмства са слоўнікавым словам і вылучэнне ў ім неправяраемай або цяжка правяраемай арфаграмы.

**Рукапісны варыянт слоўнікавых слоў** (літары арфаграм у словах падаюцца курсівам і выступаюць часткай малюнка-апоры) пажадана раздрукаваць для кожнага вучня. Дзецям прапануецца абвесці літару (літары) неправяраемай арфаграмы з мэтай стварэння зрокава-рухальнага вобразу слова. Паступова вывучаючы слоўнікавыя словы, вучні могуць расфарбоўваць адпаведныя малюнкі. Такім чынам, у кожнага вучня з'явіцца каляровы слоўнік, які можна выкарыстоўваць не толькі падчас знаёмства са слоўнікавым словам, але і ў ходзе паўтарэння і замацавання правапісу раней вывучаных слоў.

**Практыкаванні са слоўнікавымі словамі** можна раздрукаваць для кожнага вучня. Яны выкарыстоўваюцца не толькі для выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў, але і для замацавання вывучаемага граматычнага матэрыялу. Прымяненне розных па змесце пісьмовых практыкаванняў будзе садзейнічаць пашырэнню і ўдакладненню актыўнага слоўнікавага запасу вучняў, развіццю іх маўлення, творчых здольнасцей. Прадстаўленыя практыкаванні можна арганічна ўключаць у працу па тэме ўрока, а таксама выконваць на стымулюючых занятках. На эфектыўнасць засваення слоўнікавых слоў будзе ўплываць выкарыстанне разнастайных метадычных прыёмаў.




*Сачыце за рэкламай на сайце **www.aiv.by***
*Кнігі можна набыць у кіёску выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»*
*ці ў інтэрнэт-краме (кнігі дасылаюцца па Беларусі накладной платай).*
*Магчымы наяўны (безнаяўны) разлік.*